*Крыніца: НГАБ у Гародні. Ф. 1. В. 18. Спр. 773. Арк. 14-20 адв.*

Асобна 6 жніўня 1902 г. гарадзенскі спраўнік паведаміў, што «у маёнтку Жыдомля, які належаў генеральшы Дзяконскай, але арандуецца Анджэеўскім, коннага завода няма» [3, арк. 11]. Аднак анкета на завод у Жыдомлі была заведзена і запоўнена па наступных пунктах: п. 1 – 2; п. 2 – 6; п. 4. – верхавы; п. 5. – паўкроўна-англійская [3, арк. 13-13 адв.].

Такім чынам, на 1902 г. з больш чым трох дзясяткаў конных заводаў Гарадзенскай губерні ў ваколіцах Гародні дзейнічала пяць. Адно прадпрыемства, якое належала Маўрыкію О-Брыену дэ Ласі існавала больш чвэрці стагоддзя. Памеры прадпрыемстваў былі невялікімі, а найбольшым з іх з’яўляўся завод Зміцера Карыбут-Дашкевіча. Гарадзенскія конезаводчыкі спецыялізаваліся на вытворчасці пераважна верхавых коней, а базавай пародай была англійская, хаця не грэбавалі і так званай мясцовай.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Гродненская губерния. / Сост. П. Бобровский. – Ч. 2. – СПб., 1863. – 1077 с.
2. Нарысы гісторыі культуры Беларусі. У 4 т. Т. 1. Культура сацыяльнай эліты XIV-пачатку XX ст. – Мінск, 2013. – 575 с.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гародні. Ф. 1. В. 18. Спр. 773.

УДК 357. 23 (091) “1902” (476.6)

# ЗВЕСТКІ ПРА КОННЫЯ ЗАВОДЫ Ў ГАРАДЗЕНСКАЙ ГУБЕРНІ НА 1902 ГОД

**Галубовіч В. У.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Летам 1902 г. у Гродзенскай губерні быў праведзены перапіс сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, якія патраплялі пад крытэрыі так званага коннага завода. Выкананне мерапрыемства ўскладалася губернскімі ўладамі на паліцыю, што гарантавала адносную дакладнасць звестак, якія належала збіраць па схеме, прапанаванай у адмыслова складзенай анкеце. Адпаведныя рапарты аб выкананні загаду павінны былі падрыхтаваць павятовыя спраўнікі [3, арк. 1-5 адв.].

Відаць, першым (у другой палове ліпеня 1902 г.) выканаў пастаўленую задачу не гарадзенскі спраўнік, які канчатковую

інфармацыю пра наяўнасць пяці заводаў у падлеглым яму павеце даслаў толькі на пачатку жніўня [1, арк. 11-20 адв.], а пружанскі [3, арк. 9].

Табліца 1 – Спіс уласнікаў конных заводаў у Пружанскім павеце

| Уласнік |
|---|
| Дзяконскі Марыян Альбінавіч |
| Кавальскі Антон Валер'янавіч |
| Ней-Гофлен Рамуальд Рамуальдавіч |
| Трэмбліцкі Ўладзіслаў Багуслававіч |

*Крыніца: НГАБ у Гародні. Ф. 1. В. 18. Спр. 773. 10.*

Рапарт спраўніка Ваўкавыскага павета, адпраўлены 7 жніўня, трапіў у губернскую канцылярыю 9 жніўня 1902 г і ўтрымліваў наступнае ўдакладненне: «конныя заводы Глазера ў маёнтку Духаўляны, Булгарына ў маёнтку Ятвеск, Зурава ў маёнтку Князева, Красіцкага і Крэтовіча ў маёнтку Дзятлавічах у цяперашні час не існуюць» [1, арк. 22].

Табліца 2 – Спіс уласнікаў конных заводаў у Ваўкавыскім павеце, складзены 7 жніўня 1902 г.

| Уласнік | Месцазнаходжанне |
|---|---|
| Ельскі Чэслаў | м. Хацькоўцы |
| Жарабкоў Міхаіл | м. Крэмяніца |
| Жарабкоў Міхаіл | м. Рагозніца |
| Зурава Вольга | м. Князева |
| Залютскі Севярын | м. Духаўляны |
| Шыраеў Уладзімір | м. Харашэвічы |

*Крыніца: НГАБ у Гародні. Ф. 1. В. 18. Спр. 773. Арк. 23.*

Анкетаваннем у Ваўкавыскім павеце былі таксама ахоплены заводы, якія ўжо не існавалі на 1902 г.

Табліца 3 – Звесткі пра няісныя конныя заводы у Ваўкавыскім павеце

| Уласнік | Месцазнаходжанне |
|---|---|
| Булгарын, генерал-маёр | м. Ятвеск |
| Глазер Баляслаў Антонавіч | м. Духаўляны |
| Міончынскі Восіп Вітольдавіч | м. Вялікая Свеніца, чыг.ст. Ваўкавыск |
| Граф Красіцкі | м. Дзятлавічы |
| Крэтовіч Баляслаў Александравіч | м. Дзятлавічы |
| Генерал-лейтэнант Зураў | м. Князева |

*Крыніца: НГАБ у Гародні. Ф. 1. В. 18. Спр. 773. Арк. 25-30 адв.*

Пра сітуацыю ў Беластоцкім павеце мясцовы спраўнік у ліпені і жніўні 1902 г. адпісваў, што там конных заводаў няма [1, арк. 31], але захаваліся анкетныя звесткі пра ўжо няісны завод у маёнтку Янаўка, які належаў Міхаілу Акімавічу Валовічу, і завод у маёнтку Мрочкі, які належаў Гарабурдзе Генрыху Антонавічу [1, арк. 36-37 адв.].



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Слонімскі павятовы спраўнік у адказ на патрабаванне прадставіць патрэбную інфармацыю пісаў наступнае: «прадстаўляючы пры гэтым звесткі пра конныя заводы ў маёнтку Вішнева, двараніна Канстанціна Гнаінскага, маю гонар данесці Вашай Вялікасці, што з былых у Слонімскім павеце конезаводчыкаў Трубяцкі і Аляксандраў выбылі з павета, Мілашэўскі памёр, пасля чаго існаванне конных заводаў спынілася, а Міхалоўскі і Юсціцкі ў цяперашні час заводскіх коней не ўтрымліваюць» [1, арк. 38-38 адв.].

Табліца 4 – Звесткі з апросных анкет пра былыя конныя заводы ў Слонімскім павеце:

| Уласнік | Месцазнаходжанне |
|---|---|
| Князь Трубяцкі Васіль Андрэевіч | Мястэчка Косава м. Мерчаўшчызна |
| Мілагеўскі Рышард Лявон Мікалаевіч | м. Бліна, чыг. ст. Азярніца |
| Аляксандраў Міхаіл Аляксандравіч | м. Мерчаўшчызна |
| Міхайлоўскі | м. Бякевічы, чыг. ст. Азярніца |
| Юсціцкі Міхаіл Антонавіч, адст. палкоўнік | м. Явар |

*Крыніца: НГАБ у Гародні. Ф. 1. В. 18. Спр. 773. Арк. 39-43 адв.*

Табліца 5 – Спіс уласнікаў конных заводаў у Кобрынскім павеце

| Уласнік | Месцазнаходжанне |
|---|---|
| Бобрынская Надзея Аляксандраўна | м. Закозель |
| Дзяконскі Альбін Фадзеявіч | м. Пятровічы |
| Яленскі Іосіф Казіміравіч | м. Опаль |
| Завадскі Міхаіл Алегавіч | м. Дзераўная |
| Кантараў Мікалай Паўлавіч | м. Людвікава |
| Мазеўскі Карл Баляслававіч | м. Кантынаў |
| Навамейскі Севярын Феліксавіч | м. Іменін |
| фон Энгельгардт Эбба Эрнестаўна | м. Булькава |

*Крыніца: НГАБ у Гародні. Ф. 1. В. 18. Спр. 773. Арк. 45.*

Асобна трэба згадаць звесткі з рапарта кобрынскага павятовага спраўніка ад 7 жніўня 1902 г. пра тое, што «конны завод Марыі Казіміраўны Ганецкай перайшоў да баранэсы Энгельгардт, а заводы Вітальда Віктаравіча Орды, Пятра Пятровіча Шцера і Пятра Аляксеевіча Шцера зачынены» [1, арк. 44]. Тым не менш, анкеты пра гэтыя заводы захаваліся і дазваляюць скласці ўяўленне пра спецыфіку іх працы.

Спраўнікі Берасцейскага і Бельскага паветаў таксама прадставілі ў губернскую канцылярыю зводныя ведамасці пра колькасць заводаў, іх уладальнікаў і размяшчэнне. На жаль, да іх не былі прыкладзеныя ці не захаваліся анкеты.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Табліца 6 – Спіс уласнікаў конных заводаў у Берасцейскім павеце

| Уласнік | Месцазнаходжанне |
|---|---|
| Пузына Аляксандр Іосіфавіч | м. Астрамечава |
| Паніквіцкі Фабіян Феліксавіч | м. Шчытнікі |
| Рот Іван Канстанцінавіч | м. Вярховічы |
| Урсын-Нямцэвіч Іван Іванавіч | м. Скокі |

*Крыніца: НГАБ у Гародні. Ф. 1. В. 18. Спр. 773. Арк. 51.*

Табліца 7 – Спіс уласнікаў конных заводаў у Бельскім павеце

| Уласнік | Месцазнаходжанне |
|---|---|
| Віслоцкі Франц Анфімавіч, дваранін | м. Забалаці |
| Пянькоўскі Сатурнін Людвікавіч, дваранін | м. Долабава |
| Ржавускі Людвік Іванавіч, дваранін | м. Таргавіск |
| Тарасевіч Антон Антонавіч, дваранін | м. Сямены |
| Цяцэрскі Генрых Сцяпанавіч, дваранін, Воўк Густаў Юльянавіч, дваранін | м. Чартаева |
| Шчука Канстанцін, дваранін | м. Антонін |

*Крыніца: НГАБ у Гародні. Ф. 1. В. 18. Спр. 773. Арк. 53*

Высновы. Паводле сабраных паліцыяй звестак, у Гарадзенскай губерні, за выключэннем Сакольскага павета, на 1902 г. дзейнічалі 33 конныя заводы. Гэта інфармацыя дазваляе падкарэктаваць вядомую статыстыку пра колькасць заводаў і аспрэчыць лідэрства ў гэтай справе Менскай губерні [2].

Як вынікае з рапартаў спраўнікаў, у некаторых паветах Гарадзенскай губерні заводаў не было ўвогуле. Стварэнне такіх прадпрыемстваў было выклікана, галоўным чынам, патрэбамі маёнткавай гаспадаркі, таму лагічна, што конныя заводы належалі пераважна абшарнікам і размяшчаліся ў маёнтках.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гародні. Ф. 1. В. 18. Спр. 773.
2. Нарысы гісторыі культуры Беларусі. У 4 т. Т. 1. Культура сацыяльнай эліты XIV-пачатку XX ст. Мінск, 2013. 575 с.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ